*Таццяна Рабец*

# САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЫНАМІКА БЕЛАРУСКІХ ЗАМОЎ

Увага да замоў, якія адносяцца да ліку найбольш устойлівых жанраў беларускага фальклору, абумоўлена актуальнай на сённяшні дзень праблемай рэканструкцыі старажытнай духоўнай культуры. Відавочныя зрухі ў свядомасці народу, разбуральнае ўздзеянне працэсаў урбанізацыі і паступовай дэпапуляцыі вёскі, атэізм і барацьба савецкай улады з любымі светапоглядными «перажыткамі», высокі ўзровень афіцыйнай медыцыны ў цэлым не здолелі каардынальна паўплываць на замоўна-заклінальную традыцыю беларусаў.

У наш складаны і супярэчлівы сацыяльна-эканамічны час рэзка ўзрасло памкненне людзей да магіі як аднаго з ірацыянальных спосабаў вырашэння праблем грамадства і асобы. Гэта праявілася ў моцнай зацікаўленасці людзей «магічнымі» жанрамі фальклору, ва ўстойлівым інтарэсе да астралогіі, хірамантыі, экстрасэнсорыкі і г.д. У апошнія гады з'явілася таксама шмат кінафільмаў, кніг, камп'ютарных гульняў, у якіх уздымаюцца пытанні, звязаныя з вобласцю магічнага і звышнатуральнага. У сувязі з гэтым аб'ектыўнае вырашэнне праблемы рацыянальнага, гнасіялагічнага даследавання сутнасці феномена сучаснай магіі, выдзяленне ў ёй аспектаў, якія ўплываюць на фарміраванне светапогляду ў межах сацыяльных і культурных умоў, з’яўляецца прыярытэтным кірункам даследавання духоўнай культуры беларусаў. Гэта магчыма толькі пры ўмове ўважлівага разгляду генезісу ўяўленняў пра магію ў грамадстве ў працах розных вучоных, што, у сваю чаргу, забяспечвае выяўленне механізму ўплыву магічнага на светапогляд народу.

Магічныя дзеянні чалавека, як сведчаць судовыя дакументы XVIII–XIX стст., заўсёды стаялі поруч з замовамі – слоўнымі выражэннямі магічнага дзеяння. Зразумела, што роля замоўна-заклінальнай практыкі аказваецца пераважна кампенсацыйнай, бо яна стварае ілюзію ажыццяўлення практычна дзейсных учынкаў, што, безумоўна, не выключае магчымасці дабратворнага псіхаэмацыянальнага і энэргетычнага ўздзеяння замаўляльніка на самаадчуванне чалавека або досыць рэальнага псавання адносінаў паміж людзьмі з прычыны мэтанакіраванай нядобразычлівасці. Патрэба карыстацца замовамі, як правіла, узнікае ў сітуацыях эмацыянальнага стрэсу: жыццёвы крызіс, крушэнне важнейшых надзей, смерць, хваробы, няшчаснае каханне або няўтольная нянавісць. У такіх выпадках інстынктыўныя і эмацыянальныя здольнасці чалавека, яго практычны вопыт могуць заводзіць у такія тупіковыя сітуацыі, калі не дапамагаюць ўсе яго веды, выяўляюць сваю абмежаванасць сілы розуму, не спрацоўваюць нават хітрасць і назіральнасць. У такія моманты чалавек звяртаецца да замоў, што даюць яму шэраг гатовых рытуальных актаў і стандартных вераванняў. Гэта дазваляе не губляць прысутнасць духу, захоўваць самавалоданне пры вырашэнні самых цяжкіх жыццёвых задач.

Такім чынам, функцыя замоў заключаецца ў рытуалізацыі чалавечага аптымізму, у падтрымцы ўпэўненасці ў поспеху яго дзеянняў. Замовы ўсяляюць ў яго веру, без якой ён не змог бы справіцца з жыццёвымі нягодамі, умацоўваюць дух і дазваляюць сабрацца з сіламі ў складаных абставінах.

Апошнія дзесяцігоддзі адзначаны ўзвышанай цікавасцю да замоў, перш за ўсё актывізацыяй работы па збіранні, публікацыі і сістэматызацыі тэкстаў замоў. Сярод беларускіх зборнікаў вылучаецца том «Замовы» (1992 г.) серыі «Беларуская народная творчасць», у які ўключана больш чым тысяча тэкстаў, узятых як з дарэвалюцыйных зборнікаў, так і запісаных у 70–80-я гады ХХ ст. У гэтым жа годзе выйшаў з друку яшчэ адзін зборнік замоў «Бабуля так лячыла… Замовы ад хвароб» (уклад. Г. А. Барташэвіч). У 2009 г. быў апублікаваны зборнік беларускіх замоў «Замовы» (уклад. У. А. Васілевіч, Л. М. Салавей), у якім змешчаны тэксты замоў, сабраныя студэнтамі БДПУ падчас палявой практыкі на мяжы мінулага і цяперашняга стагоддзяў. Да цяперашняга часу карыстаюцца вялікай папулярнасцю зборнікі «Таямніцы замоўнага слова» (уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак) і «Магія слова чароўнага» (уклад. І. І. Крук). З'явілася таксама шмат рэгіянальных публікацый тэкстаў замоў, напрыклад: «Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1: Народная медыцына беларусаў Падзвіння» (2007 г.), «Полесские заговоры (в записях 1970 – 1990 гг.)», фальклорна-этнаграфічны зборнік «На моры-акіяне, на востраве Буяне… (лекавыя замовы Гомельшчыны)» (уклад. С.А. Вяргеенка) і інш.

Запісы і публікацыі замоў апошніх гадоў адлюстроўваюць усё больш узрастаючы ўплыў кніжнай прадукцыі на бытаванне замоўнай традыцыі: людзі купляюць сучасныя выданні замоў, перапісваюць іх, а фальклярысты фіксуюць і зноў публікуюць, пры гэтым нават не заўсёды ведаюць іх першакрыніцу. Няцяжка прадбачыць, што і замовы, складзеныя сучаснымі знахарамі, таксама будуць з цягам часу часткова засвоены традыцыяй і зазнаюць на сабе працэс фальклярызацыі.

Вынікі сучасных фальклорна-этнаграфічных экспедыцый сведчаць пра тое, што сацыякультурныя змены ў грамадстве не так ужо істотна паўплывалі на структурна-семантычныя і функцыянальныя прыметы замоў. Змяняючыся, замовы захавалі ўсе фармальныя рысы, якія былі характэрны для замоў XIX – пачатку XX ст. Да нашага часу добра захаваліся замовы «Ад спуду», «Ад урокаў», «Ад зубнога болю», «Ад крыві», «Ад гадзюкі», «На сон», «Ад рожы», «Ад звіху», «Прысушкі» і інш. І ў той жа час вельмі рэдка можна сустрэць замовы «Ад ліхаманкі», «Ад падвею», «Ад каўтуна», што часткова тлумачыцца стратай традыцыйных уяўленняў пра гэтыя хваробы сярод насельніцтва Беларусі. У той жа час з'явіўся цэлы шэраг наватвораў, складзеных па ўсіх канонах класічных узораў замоўнай традыцыі. Гэта замовы «Ад рэўматызму», «Ад паліпаў у носе», «Ад каларадскіх жукоў» і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэба заўважыць, што для замоў канца XX – пачатку XXI ст. характэрная некаторая дэхрысціянізацыя замоўнай традыцыі. У большасці замоў адсутнічаюць малітоўныя ўступы і закрэпкі, характэрныя для замоў пачатку XX ст., напрыклад: *«Первым разам, добрым часам»* [1, с. 127] або *«Дунуў, дух не мой – Господні. Мой дух прылюбі, а Господні дух стань на помач. Амінь»* [1, с. 127]. Акрамя таго, сучасныя тэксты беларускіх замоў вызначаюцца кароткай формай і адсутнасцю разгорнутага шматпланавага апавядальнага элемента. Замовы пачынаюць нагадваць прыгаворы, якія суправаджаюць і апісваюць магічныя дзеянні знахара. Відавочна, што менавіта кароткасць замоўных тэкстаў садзейнічала іх больш шырокаму, у параўнанні з сюжэтна складанымі замоўнымі тэкстамі, распаўсюджванню сярод носьбітаў замоўна-заклінальнай традыцыі.

Асобныя сюжэты, формулы, словазлучэнні сучасных замоў застаюцца амаль нязменнымі на працягу многіх стагоддзяў. На нашу думку, гэта абумоўлена народнымі вераваннямі ў тое, што замовы толькі тады будуць мець сілу, калі будуць выконвацца без змен і пропускаў. Так, у беларускіх замоўных тэкстах знайшлі адлюстраванне многія традыцыйныя формулы, характэрныя ўвогуле для ўсходнеславянскіх замоў. Сярод іх можна вылучыць: 1) **формулы дзеяння**, якія адлюстроўваюць функцыі персанажаў: формулы выгнання хваробы туды, дзе нічога не адбываецца, формулы знішчэння, формулы пабрацімства, формулы задобрывання і інш.; 2) **формулы «фона»**, якія адлюстроўваюць час, месца дзеяння, месца выгнання, стан персанажаў і іншыя апісальныя элементы замовы: тапаграфічныя формулы, часавыя формулы, формулы цудоўнага загароджвання і інш.; 3) **кампазіцыйныя формулы**: формулы пераліку, формулы параўнання і г.д. Многія замоўныя матывы таксама застаюцца нязменнымі, напрыклад, матыў змывання хваробы вадой, матыў загрызання і інш.

У той жа час і замоўна-заклінальная традыцыя ў цэлым, і асобныя элементы тэкстаў замоў досыць значна эвалюцыяніравалі. І ў тэксты замоў, і ў апісанні дзеянняў, якія суправаджаюць іх вымаўленне, трапляюць асобныя сучасныя рэаліі. У многіх замовах нярэдка сустракаецца сучасная лексіка або лексіка, якой няма ў матэрыялах XVIII–XIX стст.: *«На сінім моры сіні камень ляжыць – буян <u>Ланорскі</u>...»* [1, с. 92], *«Сядзіць, нічога не робіць, толькі <u>салфеты</u> засьцілаіць...»* [1, с. 142]. Паралельна з абнаўленнямі ў змесце замовы нярэдка губляюць рэаліі, якія перастаюць быць актуальнымі. Напрыклад, з пераліку прадстаўнікоў царкоўнай улады знікаюць папы і епіскапы, архіепіскапы і інш. Паступова трансфармуецца стылістыка замоў: новыя рысы з'яўляюцца ў адлюстраванні прасторы, апісаннях знешнасці чалавека і яго жыцця: *«Иди на хмарь, на старый плуг, на горький лук, на ворота деревянные, на поделы окаянные, на свиное рыло»* [1, с. 143]. Многія вобразы і сюжэты запазычваюцца з іншых фальклорных жанраў: *«Яжэ прашу цебя, жаба-жабіца, руская дзявіца, <u>ўстань перада мной, как ліст перад травой</u>»* [1, с. 146], *«<u>Вецер, ты магуч</u>, ты дуеш па паднябесьсі, носішся па ўсім сьвеце...»* [1, с. 95].

Трэба адзначыць, што ступень захаванасці і асаблівасці бытавання замоў на тэрыторыі Беларусі залежаць ад пэўнага рэгіёну. Дынаміка рэгіянальнай фальклорнай традыцыі – гэта праблема, якая можа быць асветлена на матэрыяле любога рэгіёну, але ў кожным выпадку яе вырашэнне мае сваю спецыфіку. Абавязковай умовай вывучэння рэгіянальных асаблівасцей замоў з'яўляецца наяўнасць вынікаў паўторных выездаў у месцы першапачаткова зафіксаванай замоўнай традыцыі.

Такім чынам, высвятленне сучаснага стану замоўна-заклінальнай традыцыі і вызначэнне перспектыўных шляхоў яе вывучэння – адзін з аспектаў важнейшай для фалькларыстыкі праблемы захавання культурнай спадчыны. Гэта пытанне аб месцы і значэнні замоў у духоўным жыцці нашага сучасніка, аб асаблівасцях фальклорнага працэсу ў нашы дні. Замовы раскрываюць перад намі скарбы народных ведаў пра жыццё і сусвет, даюць нам ключ для разумення таямніц прыроды, фарміравання правільнага светапогляду, асэнсавання аб'ектыўнай карціны свету.

**Спіс літаратуры:**

1. Полацкі этнаграфічны зборнік / склад. А. У. Лобач, У. С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – Вып. 1, ч. 1 : Народная медыцына беларусаў Падзвіння. — 148 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ